**УДК 947,6 (“1914 – 1918”)**

# ДЗЕЙНАСЦЬ МІНСКАЙ ГУБЕРНСКАЙ ХАРЧОВАЙ КАМІСІІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***В.М. ХАДАНЁНАК***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Разглядаецца дзейнасць Мінскай губернскай харчовай камісіі ў перыяд 1915 – 1917 гадоў. На аснове шырока скарыстаных архіўных крыніц аналізуецца яе роля ў забеспячэнні насельніцтва не акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі прадуктамі, фуражом, асобнымі прадметамі першай неабходнасці. Паказаны цяжкасці, з якімі прыйшлося сутыкнуцца камісіі ў барацьбе са спекуляцыяй і дарагоўляй. Робіцца выснова, што, нягледзячы на адсутнасць адпаведнага фінансавання, слабую сувязь з мясцовымі (павятовымі) аддзяленнямі, перагружанасць чыгуначных шляхоў і адсутнасць неабходнай колькасці транспарта, дзеянне законаў, якія абмяжоўвалі ўвоз і вываз вызначаных катэгорый прадуктаў сілкавання, Мінская губернская харчовая камісія аказала істотную дапамогу насельніцтву ў барацьбе з голадам і спекуляцыяй падчас першай сусветнай вайны.*

Дзейнасць Мінскай губернскай харчовай камісіі доўгі час заставалася па-за ўвагаю даследчыкаў. Між тым ва ўмовах першай сусветнай вайны яна адыгрывала значную ролю ў забеспячэнні насельніцтва неакупаванай тэрыторыі Беларусі прадуктамі харчавання, фуражом, асобнымі прадметамі першай неабходнасці. Ад яе спраўнага функцыянавання часта залежыла не толькі жыццё грамадзянскага насельніцтва, але і ўтрыманне арміі ў прыфрантавой паласе.

Мінская губернская харчовая камісія была заснавана пры земскай управе згодна з рашэннем нарады старшыняў мінскіх губернскай і павятовай земскіх управаў 9 лістапада 1915 года. Працаваць яна пачала амаль праз 2 тыдні – 20 лістапада 1915 года. Варта зазначыць, што ў дзейнасці Мінскай губернскай харчовай камісіі актыўны ўдзел прымалі даволі вядомыя на той час асобы: Р.А. Скірмунт (старшыня), М.В. Доўнар-Запольскі (прадстаўнік гарадской камісіі па надзённых патрэбах), А.В. Бонч-Асмалоўскі [1, арк. 1]. Апроч пазначаных дзеячоў у яе склад уваходзілі: старшыня Мінскай губернскай земскай управы (ён жа ўпаўнаважаны старшыні асобай нарады па харчовай справе па Мінскай губерні), прадстаўнікі губернскай земскай управы, гарадской і павятовай харчовых камісій, прадстаўнікі чыгуначнага ведамства, губернскі земскі аграном.

Харчовая камісія ў першую чаргу займалася нарыхтоўкай усіх неабходных прадуктаў і размеркаваннем іх паміж паветамі, у залежнасці ад патрэбы і колькасці чыгуначнага транспарта, які даваўся ў яе распараджэнне; аказвала дапамогу губернскай прысутнасці ў забеспячэнні насельніцтва семяннымі матэрыяламі; змагалася з дарагоўляй і спекулянтамі.

Ва ўмовах ваеннага часу станоўчае вырашэнне шмат якіх пытанняў наўпрост залежала ад ступені ўзаемадзеяння Мінскай губернскай харчовай камісіі са сваімі мясцовымі прадстаўніцтвамі ў паветах. Але ўпаўнаважаныя па паветах зрэдку наведвалі пасяджэнні камісіі, што прыводзіла да страты сувязяў паміж губернскімі органамі і павятовымі. Часам Мінская харчовая камісія ўвогуле не мела звестак аб патрэбах паветаў, і гэтым самым ставіла апошнія ў цяжкае становішча пры выпісцы харчовых прадуктаў [1, арк. 32].

Слабая дзейнасць мясцовых харчовых камісій, якія рэдка збіраліся і не прымалі колькі-небудзь эфектыўных рашэнняў, прывяла да таго, што ўсю іх працу з цягам часу ўзялі на сябе павятовыя земскія ўправы, якія і сталі самастойна весці ўсе іх справы. Дадзены стан рэчаў ніякім чынам не задавальняў Мінскую губернскую харчовую камісію, таму яна “… настойліва прасіла павятовыя ўправы ў мэтах ажыўлення дзейнасці павятовых харчовых камісій прыцягнуць да іх працы прадстаўнікоў гарадоў і мясцовых грамадскіх арганізацый, асабліва прадстаўнікоў сельска-гаспадарчых таварыстваў і мясцовых кааператываў (спажывецкіх таварыстваў, крэдытных і фінансавых таварыстваў) і па магчымасці пазбягаць запрашэнняў у харчовыя камісіі асобаў, якія займаюцца гандлем ці перапродажам харчовых прадуктаў, бо ўдзел такіх асобаў ці наўрад можа садзейнічаць барацьбе з дарагоўляй і спекуляцыяй, гэтай галоўнай задачай харчовых камісій” [1, арк. 46адв. – 47].

Малая актыўнасць павятовых харчовых камісій шмат у чым тлумачылася няздольнасцю вырашаць важкія справы, для якіх патрабаваліся адпаведныя паўнамоцтвы. Што казаць, калі нават “… параённыя камітэты Харкаўскі, Варонежскі і Растоўскі не прымалі нарадаў Мінскай Харчовай камісіі без пацверджання з боку цэнтральнага камітэта” [2, арк. 46].

Бадай адной з самых вялікіх праблем, з якой давялося сутыкнуцца Мінскай губернскай харчовай камісіі, была адсутнасць магчымасці свабодна набываць прадукты. На іх продаж і правоз накладаліся пэўныя абмежаванні, якія стваралі істотныя перашкоды для дзейнасці арганізацыі. Так, на паседжанні

14 снежня 1915 года камісія заслухала лісты пастаўшчыкоў Касцянецкага і Рубінчыка аб немагчымасці адправіць набытыя імі харчовыя і фуражныя грузы з-за забароны на вываз іх з Кіеўскай ваеннай акругі і Палтаўскай губерні [2, арк. 5]. Ужо праз тыдзень Канстанцінаўскі паведамляў аб немагчымасці вывезці 2 вагоны грэчкавых круп і прасіў узбудзіць хадайніцтва перад галоўным начальнікам адэскай ваеннай акругі па станоўчаму вырашэнню гэтага пытання [2, арк. 94]. Між тым асобныя прадукты харчавання ў ваенны час можна было набыць толькі ў некаторых рэгіёнах. Так, неабходную колькасць сметанковага масла маглі прадаставіць толькі Волагда і Яраслаўль. Да таго ж, з-за дэфіцыту прадуктаў выстаўлялася патрабаванне аб абавязковым суправаджэнні груза на ўсім працягу яго следавання [3, арк. 9]. Крайне абмежаваны рынак мела Мінская губернская харчовая камісія і для набыцця скаціны (3 паветы Мінскай губерні і 5 паветаў Чарнігаўскай) [1, арк. 1адв.]. Закупка яе праходзіла па вельмі высокіх цэнах.

Дадатковыя складанасці ўзнікалі з-за таго, што не было дэталёва рэгламентавана, хто быў той апошняй інстанцыяй, якая давала “дабро” на вываз прадукцыі. Адны спецыялісты па нарыхтоўцы пераконвалі, што гэта галоўны ўпаўнаважаны па нарыхтоўцы хлеба для патрэбаў арміі з Міністэрства земляробства, другія прапаноўвалі звяртацца ў Міністэрства земляробства па адрасу “Петраград «Перасяленец»”, трэція тэлеграфавалі ў “Петраград «Цэнтрмука»” [4, арк. 95]. Адпаведна папяровая важданіна прыводзіла да шматлікіх непаразуменняў і затрымак у працэсе набыцця і дастаўкі прадуктаў.

Пэўную дапамогу ў атрыманні дазволу на пакупку і перавозку харчовых грузаў прапаноўвалі шматлікія пасрэднікі, як дзяржаўныя служачыя, так і прыватныя асобы. Часам гэта былі людзі, якія па роду сваёй дзейнасці ніякім чынам не былі звязаныя з гандлем (урачы, настаўнікі і г.д.). Напрыклад, ветэрынар Н.М. Максімаў прапаноўваў за высокую плату арганізаваць дастаўку сена са Стаўрапольскай губерні [2, арк. 35]. Але ж такім памагатым не давалі веры, бо вельмі часта атрымліваемы ад іх тавар быў зусім не падобны да ўзору, згодна з якім быў заказаны [1, арк. 206адв.]. Да таго ж, пасрэднікі не патрабавалі карыстацца чужымі даверанасцямі і фальсіфікаваць праязныя дакументы для атрымання дазволу на правоз грузаў. Кіраўніцтва Мінскай харчовай камісіі справядліва наракала на тое, што: “… заказаныя земскай харчовай камісіяй вагоны з харчовымі грузамі прыходзяць значна пазней за заказы прыватных асобаў. Губернская харчовая камісія не можа, напрыклад, да гэтага часу атрымаць вагоны пшанічнай мукі, які былі замоўлены яшчэ ў пачатку красавіка, у той час як прыватныя асобы атрымоўваюць свае заказы, зробленыя ўжо ў траўні. … скрайне маруднае паступленне гарадскіх заказаў перш за ўсё тлумачыцца тым, што горад і земствы не маюць “талкачоў” і не прымяняюць “змазку” чыгуначных агентаў” [1, арк. 2адв.].

Даволі часта пасрэднікі за паспяховую дастаўку таго ці іншага груза атрымоўвалі істотную яго частку ў якасці ўзнагароды. Пры гэтым з іх бралася падпіска з патрабаваннем прадаваць тавар толькі па ўстаноўленай камісіяй таксе. Але ж пасрэднікі даволі часта не прытрымліваліся дадзеных абяцанняў і займаліся спекуляцыяй. У адказ Мінская губернская камісія праводзіла рэквізіцыі ў такіх асобаў [5, арк. 2адв.].

Але ж часам без пасрэднікаў было не абыйсціся, бо прафесійныя якасці асобных супрацоўнікаў камісіі не адпавядалі патрабаванням (дрэнна вялася дакументацыя, не праводзіўся належным чынам агляд прадуктаў і іх узважванне перад пакупкай, правілы перавозкі грузаў не выконваліся). Усё гэта прыводзіла да непрадугледжаных фінансавых выдаткаў, каб хоць якім-небудзь чынам выправіць хібы ў працы асобных работнікаў. Напрыклад, пры аглядзе чарговай партыі мукі, прывезенай 24 лютага 1916 года, адказнымі супрацоўнікамі было высветлена, што яна аказалася з прызнакамі доўгага ляжання (затхласці) і пры надыходзе вясенніх месяцаў магла сапсавацца канчаткова. Таму было прынята рашэнне “… прадаць муку зараз, а ўбытак ад аперацыі прыняць на кошт Мінскай губернскай харчовай камісіі” [4, арк. 9адв. – 10]. Часам харчовыя прадукты пры транспарціроўцы насыпаліся ў ірваныя, мокрыя мяхі і пасля працяглай перавозкі прадаць іх увогуле было немагчыма. Так, 25 мая 1916 года камісія правяла агляд атрыманых па накладной за № 7825 грэчкавых круп. Аказалася, што “… крупа, як дробная так і буйная дужа засмечана, не чыстая, з істотнай прымессю свірэпкі, на пах прэлая, не сухая, з-за чаго крупа ў сярэдзіне мяхоў злучылася і ўтварыліся камякі, на смак гаркавая” [4, арк. 45]. Даходзіла да таго, што цэлыя саставы засылаліся замест аднаго горада ў другі і там прастойвалі з-за перагружанасці чыгуначных ліній. Кадравае пытанне так і не было вырашана, бо з-за масавых мабілізацый на неакупаванай тэрыторыі Беларусі адчуваўся катастрафічны недахоп працоўных рук і спецыялістаў ва ўсіх сферах жыцця.

Каб забяспечыць прадуктамі і прадметамі першай неабходнасці насельніцтва перыферыі, Мінская губернская харчовая камісія актыўна займалася адкрыццём лавак у паветах. Так, на 7 ліпеня 1916 года ў Барысаўскім павеце было 6 харчовых лавак, а менавіта: у Зембіне, Пляшчаніцах, Бярэзіне, Докшыцах, Мсціжы і Красналуках, і 3 лаўкі знаходзіліся непасрэдна ў Барысаве [1, арк. 76адв.]. Апроч таго актыўна адчыняліся харчовыя склады на чыгуначных станцыях (Крупкі, Жодзіна, Прыяміна і Вітгенштэйнская і інш.). Але іх праца выклікала шмат нараканняў у мясцовага насельніцтва. Па-першае, хоць тавары і прадаваліся там танней, чым у прыватных гандляроў, затое часта адпускаліся па знаёмству толькі членам павятовых камісій і іх родзічам (асабліва дадзеная сітуацыя была характэрна для Мазырскага павета). Па-другое, з-за бездарожжа ранняй вясной і позняй восенню дастаўка прадуктаў была немагчымай.

Былі выпадкі, калі Мінская губернская харчовая камісія пастаўляла на месцы харчаванне для спажывецкіх лавак, якіх на самой справе не існавала. Так, ад селяніна Сяргея Пугача, які пражываў у мястэчку Казіміраў Сцяпской воласці Бабруйскага павета, паступіла заява, што "… гаспадар фальварка каля мястэчка Казімірава Янкоўскі, атрымоўвае з 1-га кастрычніка 1916 г. прадукты, дзеля быццам бы адкрытай ім ва ўзгаданым мястэчку камісійнай лаўкі. Апошняй не існуе, а атрымоўваемыя прадукты Янкоўскі збывае мясцоваму гандляру Марголіну, які прадае іх па завышаных цэнах" [4, арк. 108]. Нажаль, такія прыклады былі далёка не адзінкавымі.

Харчовая камісія павінна была звяртаць пільную ўвагу і на рэгіянальныя асаблівасці ў справе ўвоза-вываза прадуктаў з той ці іншай мясцовасці. Напрыклад, жыхары Турава Мазырскага павета звярнуліся з просьбай забараніць вывозіць рыбу з іх мястэчка, бо яны заставаліся без сродкаў да існавання [1, арк. 100адв. – 101] (рыба з'яўлялася для жыхароў Турава з-за недахопа мяса галоўным прадметам харчавання).

Асобныя ўпаўнаважаныя работнікі камісіі займаліся выключна "мясным пытаннем". Асабліва яно абвастрылася пасля 30 чэрвеня 1916 года, калі выйшаў Закон "Аб мерах па скарачэнні спажывання насельніцтвам мяса і мясных прадуктаў". Быў забаронены паўсюдна ў аўторак, сераду, чацвер і пятніцу кожнага тыдня продаж мяса і мясных прадуктаў (мясных кансерваў, каўбас, сала і г.д.), а таксама выраб для продажу і падача наведвальнікам розных страў з мяса і мясных прадуктаў у рэстарацыях, корчмах, тракцірах. Таксама забараняўся па панядзелках, аўторках, серадах і чацвяргах забой буйной рагатай скаціны, цялят, авечак, ягнят, свіней і парсюкоў на бойнях. У пятніцу, суботу і нядзелю азначаны ўбой жывёлы дапускаўся ў колькасці, вызначаемай гарадскім грамадскім упраўленнем і сходам гарадскіх упаўнаважаных разам з павятовымі земскімі ўстановамі [1, арк. 378]. Выкананне дадзенага закона строга кантралявалася, па кожнаму павету штотыдзень складалася дэталёвая справаздача. Напрыклад, па Ігуменскаму павету яна выглядала наступным чынам (табліца).

Ведамасць аб колькасці штотыднёвага забоя скаціны
ва ўстаноўленыя законам дні ў населеных пунктах Ігуменскага павета

| Назва мясцовасці | Буйная рагатая скаціна | Авечкі | Свінні |
|---|---|---|---|
| Лапавічы | 3 | 2 | 2 |
| Пухавічы | 6 | 5 | 6 |
| Халуй | 2 | 3 | 1 |
| Сяліба | 2 | 3 | 1 |
| Бярэзіна | 8 | 10 | 6 |
| Багушэвічы | 1 | 3 | 3 |
| Смілавічы | 7 | 10 | 8 |
| Узляны | 2 | 3 | 1 |
| Дукора | 3 | 5 | 2 |
| Шацк | 4 | 6 | 2 |
| Узда | 6 | 8 | 6 |
| Лоша | 1 | 2 | 1 |
| Пагост | 1 | 2 | 1 |
| Пясочна | 2 | 5 | 2 |
| Магільна | 1 | 2 | 1 |
| Клічаў | 2 | 5 | 2 |
| Усяго | 51 | 74 | 45 |

Крыніца: [1, арк. 375].

Апроч за забеспячэнне прадуктамі мірнага насельніцтва, Мінская губернская харчовая камісія мусіла была дбаць пра пастаўкі фуражу і харчу ў дзеючую армію; але з-за цяжкасцяў ваеннага часу далёка не заўжды была ў стане гэта рабіць. У Мінскі губернскі аб'яднаны ваенна-прамысловы камітэт 26 студзеня 1916 года быў дасланы наступны ліст: "… Харчовая камісія паведамляе, што па яе звестках Мінская губерня не мае ніякай магчымасці забяспечваць армію ніякімі прадметамі фуражу і харчу, бо сама мае ў іх патрэбу і з цяжкасцю і далёка не ў поўнай меры здабывае іх пакупкай у іншых мясцовасцях імперыі" [6, арк. 4 – 4адв.]. Прычым з цягам часу сітуацыя рабілася ўсё больш цяжкай. Гэта яскрава бачна з дынамікі паставак мукі ў горад Мінск у 1916 годзе: "… студзень – 224.000 пудоў, люты – 313.000, сакавік – 222.000, красавік – 204.000, травень – 228.000, чэрвень – 257.000, ліпень – 133.000, жнівень – 45.000, на першы тыдзень верасня прыбыла толькі 9.580 пудоў" [7, арк. 27адв.]. Імкліва скарачаліся і нормы забеспячэння губерні цукрам: "… на чэрвень і ліпень 1916 г. была вызначана норма 123 вагоны, на жнівень

і верасень 100 вагонаў, затым зменшана да 88 вагонаў, прычым з гэтай колькасці толькі 54 вагоны абяцалі выслаць адразу, а астанія 34 – пасля" [7, арк. 7].

У некаторых мясцовасцях сітуацыя была ўвогуле катастрафічнай. Так, з пратакола пасяджэння камісіі ад 1 снежня 1915 года бачна, што: "… у насельніцтва Наваградскага павета літаральна няма ніякіх прадуктаў харчавання, няма нават бульбы. Гэта тычыцца тых 5 ці 6 валасцей, якія не заняты немцамі, але дзе рускія вайсковыя часці ўзялі ў насельніцтва ўсё, што толькі можна было ўзяць" [3, арк. 9адв.].

Але ж, нягледзячы на ўсе цяжкасці ваеннага часу (адсутнасць істотнай дапамогі харчовымі прадуктамі з боку тылавых губерній, разладжанасць чыгуначных зносін, недахоп фінансавых сродкаў і кваліфікаваных кадравых супрацоўнікаў, наяўнасць законаў, якія абмяжоўвалі ўвоз-вываз прадуктаў і г.д.), Мінская губернская харчовая камісія здолела забяспечваць на прымальным узроўні насельніцтва харчовымі прадуктамі і фуражом, пэўным чынам абмежавала росквіт спекуляцыі ў прыватных гандляроў. У цэлым справіўшыся са сваімі задачамі, камісія была ліквідавана Часовым Урадам у сакавіку 1917 года ў сувязі з заснаваннем харчовых камітэтаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 137. – Воп. 1. – Спр. 10. Постановления Минской губернской продовольственной комиссии 7 мая – 31 августа 1916 г.
2. НГАБ. – Фонд 137. – Воп. 1. – Спр. 1. Постановления Минской губернской продовольственной комиссии 1915 г.
3. НГАБ. – Фонд 137. – Воп. 1. – Спр. 3. Протоколы заседаний Минской губернской продовольственной комиссии.
4. НГАБ. – Фонд 137. – Воп. 1. – Спр. 8. Переписка Минской губернской продовольственной комиссии с Бобруйской уездной земской управой о снабжении продовольствием населения Бобруйского уезда.
5. НГАБ. – Фонд 137. – Воп. 1. – Спр. 2. Постановления Минской губернской продовольственной комиссии 1915 г. – 1916 г.
6. НГАБ. – Фонд 137. – Воп. 1. – Спр. 7. Переписка Минской губернской продовольственной комиссии с Минским губернским объединённым военно-промышленным комитетом по вопросам снабжения армии продовольствием и фуражом.
7. НГАБ. – Фонд 137. – Воп. 1. – Спр. 11. Постановления Минской губернской продовольственной комиссии 1916 г.

*Паступіў 25.06.2012*

## ACTIVITIES OF MINSK PROVINCE FOOD COMMISSION DURING THE FIRST WORLD WAR

***V. KHADANIONAK***

*The article reviews the activity of the Minsk Province Food Commission in 1915 – 1917. On the basis of widely used archival sources, its role in provision of the population with food, fodder, essential goods on German-occupied territory of Belarus is examined. Difficulties which the commission faced in the struggle with speculation and high prices are shown. It is concluded that despite the lack of adequate funding, a weak link with the local (county) offices, railway congestion and the lack of the required number of transport, the effect of laws limiting the importation and exportation of certain categories of food, Minsk Province Food Commission provided substantial assistance to people in the fight with hunger and profiteering during World War I.*